УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
"МАГІЛЁЎСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ А.А. КУЛЯШОВА"

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар установы адукацыі
"Магілеўскі дзяржаўны універсітэт
імя А.А. Куляшова"
__________________ Дз.У. Дук
____ ________________2023

# ПРАГРАМА
уступнага экзамена па гісторыі Беларусі ў магістратуру
спецыяльнасць 7-06-0222-01 Гісторыя, прафелізацыя Айчынная гісторыя

Магілёў, 2023

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

**Мэтай** праграмы уступнага экзамену ў магістратуру па айчыннай гісторыі з'яўляецца праверка ўзроўня ведаў паступаючых з пункту гледжання далейшай падрыхтоўкі навукова-педагагічных работнікаў вышэйшай кваліфікацыі і павінна садзейнічаць фарміраванню спецыяліста як сацыяльна-актыўнай, творчай асобы. Паступаючы у магістратуру павінен вырашаць вучэбна-выхаваўчыя, навуковыя задачы, аналізіраваць мінулае, арыентавацца ў сучасным жыцці, быць патрыётам сваёй краіны.

Для рэалізацыі вызначанай мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных **задач**:

навучыць паступаючых у магістратуру знаходзіць прычынна-выніковыя сувязі гістарычных працэсаў і падзей;

прывіць ім навыкі ў вызначэнні фактараў, якія абумовілі змест, характар і асаблівасці рэгіянальнага развіцця;

сфарміраваць крытычны падыход да аналізу мінулага і правядзення яго сувязі з сучаснасцю;

садзейнічаць фарміраванню ў выпускніка вышэйшай школы актыўнай грамадзянскай пазіцыі.

Тысячагадовая гісторыя Беларусі ўяўляе важную складовую частку славянскай, еўрапейскай і сусветнай цывілізацый і займае вядучае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнцкай моладзі нашай краіны. Менавіта на гістарычных ведах фарміруецца нацыянальная свядомасць. Без ведаў сваёй гісторыі немагчыма будаваць сучаснае краіны і прагназаваць яе развіццё на будучае.

Праграма састаўлена з улікам сучасных патрабаванняў да прафесійнай падрыхтоўкі паступаючых у магістратуру і накіроўвае іх на паглыбленае вывучэнне гісторыі Беларусі. У праграме выдзелены пытанні, якія тычацца ўсіх галоўных аспектаў гісторыі Беларусі. У кола пытанняў, якія павінны засвоіць студэнты, ўваходзяць агульнатэарэтычныя пытанні адносна станаўлення і развіцця дзяржаўнасці на беларускіх землях.

Вывучэнне айчыннай гісторыі найлепшым чынам дазваляе арганізаваць фарміраванне ў паступаючых у магістратуру фундаментальных ведаў аб сацыяльна-эканамічных, палітычных этна-культурных працэсах у еўрапейскім і сусветным кантэксце і зразумець месца гісторыі Беларусі ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў; дакладна уявіць ўзаемапранікненні і ўзаемаўплывы народаў, што адбываліся на сумежжы цывілізацый Усходу і Захаду; выхоўваць на гэтай аснове пачуцця прыналежнасці да лёсу краіны і да яе гісторыі.

Праграма ўступнага экзамена по вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі» таксама мае выхаваўчае значэнне, паколькі яе засваенне ў значнай ступені спрыяе таму, што паступаючыя ў магістратуру паступова пачынаюць з абачлівасцю адносіцца да стану і развіцця нацыянальнай дзяржаўнасці.

Праграма уступнага экзамена ў магістратуру па вучэбнай дысцыпліне «Гісторыя Беларусі » распрацавана з улікам кампітэтнастнага падыходу да працэса навучання і грунтуецца на сучасных інавацыйных тэхналогіях, накіраваных на пастаяннае супрацоўніцтва выкладчыка і студэнта.

**Патрабаванні да засваення праграмы ўступнага экзамена**

Паступаючы, які рыхтуецца да сдачы уступнага экзамену па курсу гісторыі Беларусі, павінен **ведаць:**

аб’ект і прадмет гісторыі Беларусі як навукі, яе месца ў сістэме сацыяльна-гуманітарных ведаў, сувязь з іншымі гістарычнымі навукамі;

асноўныя перыяды гістарычнага развіцця Беларусі, падзеі, з’явы, даты, імёны, паняцці і заканамернасці, якія характэрны для пэўных этапаў і адносяцца да палітычнай, сацыяльна-эканамічнай гісторыі, гісторыі развіцця культуры, этнічных працэсаў, а таксама да міжнародных аспектаў айчыннай гісторыі;

гістарыяграфічныя і дыскусійныя аспекты навуковых праблем, якія разглядаюцца ў курсе айчыннай гісторыі, сучасныя навуковыя канцэпцыі, якія датычацца мінулага Беларусі.

Паступаючы, які рыхтуецца да сдачы уступнага экзамену па курсу гісторыі Беларусі, павінен **валодаць:**

вопытам аналізу вучэбнай, навуковай, навукова-папулярнай, грамадска-палітычнай літаратуры, выкарыстання сучасных тэхналогій атрымання новых ведаў у галіне гісторыі Беларусі;

асновамі методыкі самастойнай працы з крыніцамі па гісторыі Беларусі, апрацоўкі інфармацыі і выкарыстання яе ў вырашэнні прафесійных задач;

сучаснай метадалогіяй і методыкай навуковых даследаванняў у галіне айчыннай гісторыі, афармлення атрыманых вынікаў.

Паступаючы, які рыхтуецца да сдачы уступнага экзамену па курсу гісторыі Беларусі, павінен **умець:**

выкарыстоўваць атрыманыя веды па айчыннай гісторыі і прымяняць гэтыя веды пры вырашэнні вучэбна-выхаваўчых і навукова-метадычных задач.

Структура праграмы грунтуецца на вызначэнні і адборы галоўных паняццяў, ідэй, тэндэнцый, фактаў, дат, імён і іншых элементаў гістарычных ведаў, накіравана на тое, каб раскрыць сутнасныя элементы гістарычнага развіцця Беларусі; дэмаграфічную характарыстыку і сацыяльную стратыфікацыю грамадства; асноўныя палітычныя падзеі і іх уплыў на дзяржаўна-прававую эвалюцыю Беларусі; канфесійнае і этна-культурнае развіццё; найкаштоўнейшыя здабыткі духоўнага жыцця народа.

## ЗМЕСТ МАТЭРЫЯЛА

### Раздзел I. Старажытная гісторыя Беларусі. Узнікненне і развіццё першабытнага грамадства на беларускіх землях (100 – 35 тыс.гадоў да н.э. – V ст. н.э.).

**Тэма 1. Засяленне чалавекам тэрыторыі Беларусі. Жыццё і гаспадарчая дзейнасць людзей ва ўмовах першабытнага гармадства**

Пачатак засялення, актывізацыя гэтага працэсу ва ўмовах мезаліта, неаліта, перахода да веку металаў. Старажытныя паселішчы Бердыж, Юравічы. Станаўленне першабытнага грамадства, асноўныя фактары яго развіцця. Пераход да вытворчых формаў гаспадарання – земляробства і жывелагадоўлі, яго асаблівасці. Прамысловая дзейнасць, зараджэнне раместваў. Першапачатковы абмен. Формы сацыяльнай і грамадскай арганізацыі, сямейна-шлюбныя адносіны. Духоўнае жыццё, вераванні і абрады. Першабытнае мастацтва. Асноўныя дасягненні айчыннай і сусветнай навукі па вывучэнню першабытнага грамадства.

**Тэма 2. Разлажэнне першабытнага грамадства**

Індывідуалізацыя вытворчасці. Сельская абшчына, яе рысы. Сацыяльныя працэсы, складванне перадумоў для ўзнікнення маёмаснай і сацыяльнай няроўнасці, перахода да дзяржаўных формаў. Асноўная навуковая літаратура па тэме.

**Тэма 3. Развіццё этнічных працэсаў ва ўмовах першабытнага грамадства**

Даіндаеўрапейскі перыяд этнічнай гісторыі Беларусі. Археалагічныя культуры каменнага веку. Рассяленне індаеўрапейцаў. Праблема іх паходжання. Балты і іх археалагічныя культуры. З’яўленне славян на тэрыторыі Беларусі. Дыскусійныя пытанні па этнічнай гісторыі Беларусі.

### Раздзел II. Беларусь у сярэднявеччы. Станаўленне і развіццё феадалізма (VI – першая палова XIII стст.)

**Тэма 1. Рассяленне ўсходніх славян на беларускіх землях**

Лакалізацыя ўсходнеславянскіх археалагічных культур. Дрыгавічы, радзімічы, крывічы. Іх этнічныя рысы, узаемадзеянне з балтамі. Асноўныя крыніцы і навуковая літаратура.

**Тэма 2. Узнікненне і развіццё дзяржаўнасці на беларускіх землях**

Дыскусійныя аспекты праблемы. Княства на тэрыторыі Беларусі (Полацкае, Тураўскае і інш.), іх месца ў палітычнай сістэме Старажытнай Русі. Асаблівасці развіцця дзяржаўнасці ва ўдзельны перыяд. Палітычная карта Беларусі ў XI – першай палове XIII стст. Органы ўлады і кіравання. Права.

**Тэма 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё**

Стан і развіццё сельскай гаспадаркі. Узнікненне гарадоў, іх паходжанне і геаграфічнае размяшчэнне. Гарадскія рамёствы, унутраны і знешні гандаль. Грашовая сістэма. Сацыяльныя працэсы. Узнікненне і развіццё феадальных адносін. Шматукладны характар экономікі. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 4. Знешнепалітычныя ўмовы развіцця беларускіх зямель**

Сувязі з Скандынавіяй, прыбалтыйскім рэгіёнам. Удзел княстваў беларускіх зямель ва ўмацаванні бяспекі Русі ў паўдневым накірунку, развіцці сувязей з Візантыяй. Барацьба з крыжакамі, татара-манголамі. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 5. Рэлігія і культура беларускіх зямель**

Язычніцкія вераванні. Распаўсюджанне хрысціянства і яго ўплыў на развіццё культуры. Народная творчасць. Узнікненне і развіццё пісьменнасці. Літаратура. Рукапісныя кнігі (Тураўскае евангелле, інш.). Літаратурная і асветніцкая дзейнасць Ефрасінні Полацкай, Кірыла Тураўскага, інш. Летапісы. Пытанне аб Полацкім летапісу. Мясцовые школы архітэктуры. Жывапіс. Прыкладное мастацтва. Асноўныя работы айчынных навукоўцаў па тэме.

**Тэма 6. Развіццё этнічных працэсаў у старажытнарускі перыяд**

Фарміраванне ўсходнеславянскай старажытна-рускай супольнасці, яе роля ў этнагенезе беларусаў. Значэнне старажынарускага перыяда ў гісторыі Беларусі. Асноўныя пункты гледжання ў гістарычнай навуцы па пытанню.

## Раздзел III. Беларускія землі ў складзе Вялікага Княства Літоўскага (другая палова XIII – першая палова XVI стст.).

**Тэма 1. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ)**

Развіццё дзяржаўнаўтваральных працэсаў у балтаў і іх уплыў на ўзнікненне ВКЛ. Летапісная Літва, пытанне аб яе знаходжанні і ролі. Узмацненне тэндэнцый да палітычнай кансалідацыі на ўсходнеславянскіх землях. ВКЛ – адзін з цэнтраў такой кансалідацыі. Роль знешняга фактара ва ўтварэнні ВКЛ. Асноўныя дыскусійныя пытанні ўтварэння ВКЛ.

**Тэма 2. Станаўленне і развіццё ВКЛ, яго дзяржаўна-палітычны лад**

Міндоўг і яго палітыка. Барацьба ў Княстве пасля смерці Міндоўга. Аб'яднальная палітыка Віценя, Гедыміна і Альгерда. Шляхі ўключэння беларускіх зямель ў склад ВКЛ. Тэрытарыяльны рост Княства ў канцы XIV – пачатку XV стст. Дзяржаўна-палітычны строй ВКЛ, яго асаблівасці. Структура органаў улады і кіравання. Заканадаўства, судзебная сістэма. Дзяржаўная сімволіка Княства. Асноўныя дыскусійныя пытанні і навуковыя працы па тэме.

**Тэма 3. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя працэсы на беларускіх землях**

Змены ў сельскай гаспадарцы. Развіццё феадальных адносін. Запрыгоньванне сялян. Іх павіннасці. Узрастанне ролі гарадоў. Гарады – цэнтры рамяства і гандлю. Развіццё гарадскога самакіравання. Асноўныя працы па тэме.

**Тэма 4. Унутрыпалітычнае становішча ў ВКЛ, яго знешняя палітыка**

Прычыны ўнутрыпалітычных канфліктаў у Княстве. Абвастрэнне ўнутрыпалітычных супярэчнасцей у 40-я – 80-я гады XIV ст. Крэўская унія і яе ўплыў на палітычнае становішча ў Княстве. Праўленне Вітаўта. Унутрыпалітычная барацьба ў Княстве ў 30-е гады XV ст., яе характар. Становішча ў Княстве у другой палове XV – першай палове XVI стст. Паўстанне М.Глінскага. Мэты і задачы знешняй палітыкі. Адносіны ВКЛ з Маскоўскім княствам, прычыны канфліктаў. Барацьба з Тэўтонскім і Лівонскім ордэнамі. Паўднёвы накірунак у знешняй

палітыкі ВКЛ. Устанаўленне і развіццё сувязей з Польшчай. Асноўныя даследванні айчынных і замежных гісторыкаў па тэме.

## Раздзел IV. Беларускія землі у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай (другая палова XVI – першая палова XVII стст.)

**Тэма 1. Люблінская унія. Утварэнне Рэчы Паспалітай**

Прычыны уніі, яе падрыхтоўка. Люблінскі сейм 1569 г. і яго рашэнне. Дзяржаўна-палітычнае становішча ВКЛ у Рэчы Паспалітай. Роль Статута 1588 г. у забеспячэнні аўтаномнасці Княства. Абвастрэнне становішча ў Княстве пасля смерці Жыгімонта-Аўгуста. Спробы аддзялення ВКЛ ад Польшчы. Гістарыяграфія праблемы.

**Тэма 2. Станаўленне і развіццё фальваркава-паншчынай гаспадаркі на Беларусі. Урбанізацыйныя працэсы.**

Аграрная рэформа 1557 года і яе роля ў развіцці феадальнай гаспадаркі. Юрыдычнае афармленне прыгоннага права. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Колькасць гарадскіх пасяленняў, іх класіфікацыя. Сацыяльны склад насельніцтва гарадоў. Эканамічнае развіццё гарадоў. Сістэма гарадскога самакіравання, роля Магдэбургскага права ў яе афармленні і развіцці. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 3. Рэлігійна-канфесійнае становішча на Беларусі**

Праваслаўная царква і яе становішча. Рост уплыву каталіцкай царквы. Рэфармацыйны рух, яго асаблівасці і асноўныя плыні. Ідэя царкоўнай уніі, яе прыхільнікі і праціўнікі. Брэсцкі царкоўны сабор 1596 года, яго рашэнні. Узнікненне уніяцкай царквы. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

## Раздзел V. Утварэнне беларускай народнасці. Культура Беларусі другой паловы XIII – першай паловы XVII стст.

**Тэма 1. Фарміраванне беларускай народнасці**

Гістарычныя перадумовы і фактары фарміравання. Тэрытарыяльная аснова беларускай народнасці. Рост этнічнай самасвядомасці насельніцтва беларускіх зямель, формы і асаблівасці яе праяўлення. Гісторыя з’яўлення і распаўсюджання назвы “Белая Русь”, яе тэрытарыяльна-геаграфічная лакалізацыя, паходжане. Дыскусійныя аспекты этнагенеза беларусаў. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 2. Развіццё культуры беларускіх зямель**

Умовы і фактары развіцця. Рэнесанс на Беларусі, яго ўплыў на культуру. Старажытнаруская спадчына ў беларускай культуры. Народная творчасць, асноўныя напрамкі ў яе развіцці. Школы і школьная адукацыя. Роль канфесій ў яе развіцці. Кнігадрукаванне, роля Ф.Скарыны у зараджэнні і развіцці кнігавыдавецкай дзейнасці. Друкарні на тэрыторыі Беларусі. С.Будны, В.Цяпінскі, С.Собаль і іх роля ў развіцці кнігавыдавецтва. Дзейнасць І.Федарава, П.Мсціслаўца, братоў Л. і С.Зізаніяў, М.Сматрыцкага. Узрастанне ролі літаратуры ў духоўным жыцці. Мастацтва. Развіццё навуковых ведаў, філасоўскай і грамадскай думкі. Распаўсюджанне ідэй гуманізма на Беларусі. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

## Раздзел VI. Беларусь у другой палове XVII – XVIII стст. Нарастанне крызісных з’яў у Рэчы Паспалітай

**Тэма 1. Ваенныя дзеянні на беларускіх землях ў сярэдзіне - другой палове XVII ст.** Паўстанні канца 40-х – пачатка 50-х гадоў, іх прычыны, удзельнікі, характар. Пачатак паўстанняў, роля казацкіх атрадаў у разгортванні барацьбы, яе ход. Прычыны паражэння. Беларускія землі у час вайны Расіі і Рэчы Паспалітай 1654 - 1667 гг. Распаўсюджанне расійскай адміністрацыі на беларускія землі, палітыка царызма і настрой грамадства. Становішча на беларускіх землях у канцы 50 - першай палове 60-х гадоў. Андрусаўскае перамір’е, яго ўмовы. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 2. Абвастрэнне ўнутрыпалітычнага становішча ў канцы XVII – сярэдзіне XVIII стст.** Барацьба магнацкіх груповак у 1696 – 1700 гг. Уступленне Рэчы Паспалітай у Паўночную вайну. Распаўсюджанне ваенных дзеянняў на беларускія землі. Вынікі вайны для Беларусі, яе уплыў на становішча ў Рэчы Паспалітай. Унутрыпалітычная барацьба ў Рэчы Паспалітай у 20 – 30-я гады XVIII ст., аслабленне каралеўскай улады. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё беларускіх зямель**

Заняпад эканомікі беларускіх зямель у другой палове XVII – пачатку XVIII стст., яго прычыны. Стан сельскай гаспадаркі. Шляхі пераадолення яе заняпада. Разбурэнні гарадоў і мястэчак. Застой у развіцці гарадскога рамяства і гандлю. Ажыўленне эканамічнага жыцця ў сярэдзіне XVIII ст. Новыя з’явы ў развіцці феадальнай гаспадаркі, спробы яе рацыяналізацыі. Развіццё сялянскай гаспадаркі. Віды феадальнай рэнты. Маёмасная дыферэнцыяцыя сялян. Рост прамысловасці. Актывізацыя гандлёвай дзенасці. Характар эканамічных змен. Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей. Актывізацыя барацьбы сялян. Сацыяльныя канфлікты ў гарадах. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 4. Рэлігійна-канфесійнае становішча на беларускіх землях**

Абвастрэнне рэлігійных супярэчнасцей у сувязі з узнікненнем уніяцкай царквы. Умацаванне пазіцый гэтай царквы на беларускіх землях. Барацьба за захаванне праваслаўнай царквы, яе становішча ў Рэчы Паспалітай. Дзейнасць каталіцкай царквы. Пратэстанцкія рэлігійныя аб’яднанні. Распаўсюджанне на Беларусі стараабрадства. Становішча нехрысціянскіх канфесій (іслам, іудаізм). Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 5. Падзелы Рэчы Паспалітай. Уключэнне беларускіх зямель у склад Расіі (70 – 90-я гады XVIII ст.).**

Прычыны падзелаў. Абвастрэнне унутрыпалітычнага крызісу ў Рэчы Паспалітай ў пачатку 60-х гадоў XVIII ст.. Спробы рэформаў. Дысідэнцкае пытанне. Канфедэрацкі рух. Першы падзел Рэчы Паспалітай. Пачатак далучэння беларускіх зямель да Расіі. Актывізацыя дзяржаўных рэформаў у другой палове 70-х – пачатку 90-х гадоў XVIII ст. Чатырохгадовы сейм і яго рашэнні. Канстытуцыя 3 мая 1791 года. Барацьба кансерватыўных сіл супраць рэформ. Другі падзел Рэчы Паспалітай і далучэне да Расіі цэнтральнай часткі Беларусі. Паўстанне Т.Касцюшкі, яго ўдзельнікі, мэты, характар. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Я.Ясінскі і яго роля у разгортванні барацьбы ў Літве і Беларусі. Паражэнне паўстання, трэці

падзел Рэчы Паспалітай. Далучэнне да Расіі заходняй часткі Беларусі. Асноўныя навуковыя працы і дыскусійныя пытанні па тэме.

**Тэма 6. Культура беларускіх зямель**

Ускладненне ўмоў для развіцця культуры. Народная творчасць і яе роля у развіцціі культуры. Стан школьнай асветы. Дзейнасць Адукацыйнай камісссіі і яе роля ў пераходзе да свецкай сістэмы адукацыі. Літаратура. Развіццё архітэктуры і жывапісу. Музычнае мастацтва. Прыгонныя тэатры. Асноўныя накірункі ў развіцці палітычнай думкі. Ідэі Асветніцтва на Беларусі. Развіццё навуковых ведаў (М.Пачобут-Адленіцкі, К.Семяновіч і інш.). Агульная ацэнка змен у культурным развіцці беларускіх зямель. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

## Частка II. Гісторыя новага часу (канец XVIII ст. – 1917 г.)

### Раздзел I. Беларусь у перыяд крызісу феадальна-прыгонніцкага ладу (канец XVIII – 50-я гг. XIX ст.)

**Тэма 1. Палітычнае становішча беларускіх зямель у складзе Расійскай імперыі**

Змены ў сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. Мэты палітыкі на далучаных тэрыторыях, вызначаныя Кацярынай II. Правы і прывілеі дваранства. “Разбор шляхты”. Падаткі і павіннасці сялян і мяшчан. Канфесійная палітыка. Вайна 1812 г. і лёс Беларусі. Адносіны да вайны мясцовага насельніцтва. Узмацненне палітычнай рэакцыі пасля Венскага кангрэса.

Тайныя таварыствы дваранскіх рэвалюцыянераў. Паўстанне 1830-1831 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. Шляхецкая абмежаванасць праграмы яго кіраўнікоў. Зараджэнне рэвалюцыйна-дэмакратычнай плыні ў вызваленчым руху. Змены ў палітыцы царызму ў 30-я гг. Асноўныя навуковыя даследванні і дыскусійныя пытанні па праблемах.

**Тэма 2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы**

Землеўладанне і гапаспадарка памешчыкаў. Рост фальваркаў і павіннасцей сялян. Развіццё буйнапамеснай прадпрымальніцкай гаспадаркі прыгонніцкага тыпу. Вотчынная прамысловасць. Пачатак прамысловай рэвалюцыі і яе асаблівасці ў Беларусі. Суадносіны дробнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці ў канцы 50-х гг. XIX ст. Змены ў галіновай структуры прамысловасці ў 1796 – 1860 гг. Узровень гарадской, купецка-мяшчанскай прамысловасці ў параўнанні з вотчынай. Дынаміка колькасці гарадскога насельніцтва ў канцы XVIII – 50-х гг. XIX ст. Асаблівасці саслоўнага і канфесійнага складу гараджан. Прычыны рэформаў Кісялёва, іх сутнасць і значэнне. Крызіс фальварачна-паншчыннай сістэмы. Падрыхтоўка да адмены прыгоннага права. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 3. Культура Беларусі ў першай палове XIX ст.**

Школьная рэформа 1803 – 1804 гг. Пачатковая і сярэдняя адукацыя. Школьны статут 1828 г. і яго асаблівасці на Беларусі. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Развіццё славяназнаўства і беларусістыкі. Гістарычныя, этнаграфічныя і краязнаўчыя даследванні. Публікацыі беларускага фальклора ў польскім і расійскім

друку. Кнігадрукаванне і перыядычныя выданні. Бібліятэкі. Польскамоўная “краёвая” літаратура. Вытокі і станаўленне новай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы. Польскі і расійскі тэатр у Беларусі. Жывапіс. Архітэктура. Прыкладное мастацтва. Уплыў польскай і рускай культур на культуру беларускага народа. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

## Раздзел II. Беларусь у пачатковы перыяд капіталізму (60 – 90-я гг. XIX ст.)

**Тэма 4. Буржуазныя рэформы і контрэформы. Асаблівасці палітыкі царызма ў Беларусі**

Адмена прыгонага права. Ацэнка “Палажэнняў” 19 лютага 1861 г. Асаблівасці рэформы на ўсходняй і цэнтральна-заходняй Беларусі. Рэалізацыя рэформы 1861 г. Уплыў на яе паўстання 1863 г. Рэформа 1867 г. у дзяржаўнай вёсцы. Вынікі і значэнне аграрна-сялянскіх рэформаў. Феадальныя перажыткі. Рэформы інстытутаў дзяржаўнай улады. Новыя органы ў сістэме мясцовага дзяржаўнага кіравання і суда. Гарадское і сельскае самакіраванне. Асаблівасці палітыкі царызму ў заходніх губерніях у 60 – 90-х гг. XIX ст. Контррэформы. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 5. Развіццё капіталізма і фарміраванне класаў буржуазнага грамадства**

Распад дваранскага і рост буржуазнага землеўладання. Асаблівасці гэтага працэса ў Беларусі і іх прычыны. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі Беларусі. Прамысловая рэвалюцыя. Дынаміка дробнатаварнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці. Галіновая структура і размяшчэнне прамысловасці. Развіццё транспарта і сродкаў сувязі. Крэдытныя ўстановы. Уплыў адмены прыгоннага права і прамысловай рэвалюцыі на развіццё гарадоў. Прамысловыя мястэчкі. Саслоўны, канфесійны і нацыянальны склад гарадскога і сельскага насельніцтва. Фарміраванне пралетарыята і буржуазіі ў вёсцы і горадзе. Іх нацыянальны склад. Дынаміка колькасці рабочых у дробнатаварнай, мануфактурнай і фабрычнай вытворчасці. Галінова-прафесійны склад прамысловых рабочых. Рабочыя адыходнікі. Становішча рабочых і сялян. Стан вывучэння праблемы ў айчыннай навуцы.

**Тэма 6. Грамадска-палітычныя рухі**

Паўстанне 1863-1864 гг. у Польшчы, Літве і Беларусі. “Чырвоныя” і “белыя”, рэвалюцыйныя дэмакраты і шляхецкія рэвалюцыянеры. Пазіцыі К. Каліноўскага. Барацьба за кіраўніцтва паўстаннем. Тактыка паўстанцеў. Палітыка М. Мураўёва. Прычыны паражэння і значэнне паўстання. Дынаміка, віды і формы, характар сялянскага руха. Народнікі як выразнікі інтарэсаў дробных вытворцаў. Ідэйна-арганізацыйны крызіс народніцтва. Хваляванні і стачкі рабочых. Пачатак прапаганды марксізма. Пераход сацыял-дэмакратаў да масавай агітацыі і ўздым рабочага руха ў другой палове 90-х гг. Утварэнне агульнагарадскіх і рэгіянальных рабочых арганізацый сацыял-дэмакратычнага накірунка. I з’езд РСДРП і яго рашэнні. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 7. Культура Беларусі ў другой палове XIX ст.**

Змены ў сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі паводле школьнай рэформы 1864 г. Тыпы і колькасць школ. Іх праграмы. Падрыхтоўка настаўнікаў. Удзельная вага пісьменнага насельніцтва ў гарадах і сельскай мясцовасці ў канцы XIX ст. Вывучэнне гісторыі, этнаграфіі, фальклора, мовы, матэрыяльнай культуры беларусаў. Краязнаўчыя даследванні. “Заходнерусізм”. Кнігадрукаванне. Перыядычныя выданні. Беларуская літаратура. Стан беларускамоўнага друку. Мастацтва. Архітэктура. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 8. Асаблівасці ўтварэння беларускай нацыі**

Этнічная тэрыторыя беларусаў у XIX ст. паводле звестак тагачаснай навуковай літаратуры, картаграфічных матэрыялаў і перапісу насельніцтва 1897 г. Уплыў прыродна-геаграфічных і кліматычных умоў на традыцыйную матэрыяльную і духоўную культуру беларускага народа. Асаблівасці рассялення, заняткаў, саслоўна-класавай структуры и канфесийнага склада беларускага насельніцтва ў параўнанні з мясцовым рускім, польскім і яўрэйскім насельніцтвам. Узмацненне агульнасці гаспадарчага жыцця ў беларускім рэгіёне ў 60 – 90-я гг. Унутранія і знешнія міграцыі насельніцтва краю. Фарміраванне нацыянальнай (літаратурнай) мовы. Праявы этнічнай самасвядомасці. Уплыў палітыкі царызму, праваслаўнай царквы і каталіцкага касцела на працэс фарміравання сучаснай беларускай нацыі. Стан навуковай распрацаванасці праблемы.

## Раздзел III. Беларусь у перыяд буржуазна-дэмакратычных рэвалюцый (пачатак XX ст.)

**Тэма 9. Рэвалюцыя 1905 – 1907 гг.**

Абвастрэнне агульнарасійскага сацыяльна-палітычнага крызіса ў пачатку XX ст. асаблівасці яго праяў на Беларусі. Ваганні ў палітыцы царызму. “Паліцэйскі сацыялізм”. Разгортванне сіяністскага руху на Беларусі. Мясцовыя арганізацыі рэвалюцыйных партый. Рабочы і сялянскі рух. Пачатак рэвалюцыі. Вызваленчы рух у студзені – верасні 1905 г. Кастрычніцкая і снежаньская палітычная стачкі. Кааліцыйныя саветы і камітэты. Завяршэнне партыйнага афармлення трох палітычных лагераў. Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі. Трэцечэрвеньскі дзяржаўны пераварот. Вынікі і значэнне рэвалюцыі для Беларусі. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 10. Сацыяльна-эканамічнае развіццё. Рэформы П.А. Сталыпіна. Грамадскі рух ў 1907-1914 гг.**

Развіццё прамысловасці ў 1900 – 1913 гг. Дынаміка рамесна-саматужнай, дробна-капіталістычнай і цэнзавай прамысловасці. Змены ў галіновай структуры. Становішча рабочых. Прычыны, мэты і сутнасць аграрнай рэформы. Яе вынікі і значэнне. Рост сельскагаспадарчай вытворчасці. Палітычная сістэма пасля 3 чэрвеня 1907 г. і асбліваcці яе перыяда на Беларусі. Земская рэформа ў Заходніх губернiях. Вынікі выбараў у III Дзяржаўную думу ў беларускіх губернiях. Грамадска-палітычны рух на Беларусі. Газета “Наша Ніва” – ідэйна-арганізацыйны цэнтр беларускага нацыянальнага руху. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 11. Беларусь у час Першай сусветнай вайны і другой дэмакратычнай рэвалюцыі**

Пачатак вайны. Адносіны да вайны асноўных палітычных сіл. Ваенныя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Эвакуацыя і бежанцы. Заходняя Беларусь пад нямецкай акупацыяй. Эканамічная і нацыянальна-культурная палітыка акупацыйных уладаў. Беларускі нацыянальны рух у зоне акупацыі. Становішча ва ўсходняй Беларусі. Крызісны стан гаспадаркі. Ваенныя павіннасці насельніцтва. Асаблівасці рабочага і сялянскага руха ў перыяд вайны. Пачатак разлажэння арміі. Стан беларускага нацыянальнага руха на расійскай тэрыторыі. Лютаўская рэвалюцыя і яе ўплыў на ўсходнюю Беларусь. утварэнне Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і новых органаў улады. Двоеўладдзе ў войску. Губернскія з'езды сялян і іх рашэнні. З'езд беларускіх нацыянальных арганізацый. Адносіны да беларускага нацыянальнага руха расійскіх партый. Стан навуковай распрацаванасці праблемы у айчыннай гістарыяграфіі.

**Тэма 12. Культура Беларусі ў пачатку XX ст.**

Змены ў сістэме пачатковай і сярэдняй адукацыі. Развіццё прафесійнай адукацыі. Даследаванні духоўнай і матэрыяльнай культуры беларусаў, гісторыі Беларусі. Дзейнасць медыцынскіх і сельскагаспадарчых таварыстваў. Перыядычны рух і кнігадрукаванне. Беларуская літаратура ў пачатку XX ст. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. Музыка. Выяўленчае мастацтва. Архітэктура. Асноўныя навуковыя працы.

## Частка III. Гісторыя Беларусі навейшага часу

### Раздзел I. Беларусь у перыяд падрыхтоўкі і правядзення Кастрычніцкай рэвалюцыі. Барацьба за стварэнне беларускай дзяржаўнасці Замежныя ваенныя інтэрвенцыі і грамадзянская вайна на Беларусі

**Тэма 1: Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне Савецкай улады на Беларусі**

Абвастрэнне палітычнай сітуацыі летам 1917 г. Барацьба працоўных і салдат Заходняга фронту супраць карнілаўскага мяцяжу. Бальшавізацыя Саветаў. Кастрычніцкае ўзброенае паўстанне ў Петраградзе. Усталяванне Савецкай улады ў Мінску. Стварэнне Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта (ВРК) Заходняй вобласці і фронту. Пераход улады ў рукі Саветаў у Віцебску, Магілёве, Гомелі, Полацку і іншых гарадах Беларусі. Утварэнне абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці (Аблвыканкамзаха). Асноўныя дыскусійныя аспекты і навуковыя працы.

**Тэма 2: Станаўленне беларускай дзяржаўнасці**

Інтэрвенцыя і акупацыя Германіяй часткі Беларусі. Германскі акупацыйны рэжым. Брэсцкі мір і Беларусь. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, яе палітыка. Барацьба працоўных Беларусі супраць акупантаў вясной і летам 1918 года. Лістападаўская рэвалюцыя ў Германіі і вывад нямецкіх войск. VI Паўночна-Заходняя абласная канферэнцыя РК КП(б). Абвяшчэнне БССР, яе тэрыторыя. Маніфест Часовага рабоча-сялянскага ўрада Беларусі. 1-ы Усебеларускі з'езд Саветаў. Стварэнне Літоўска-Беларускай ССР, яе тэрыторыя. Гаспадарчае і

культурнае будаўніцтва ў ЛітБел. З.Ф. Жылуновіч, А.Ф. Чарвякоў, А.Ф. Мяснікоў, В.Г. Кнорын. Асноўныя дыскусійныя аспекты праблемы.

**Тэма 3: Беларусь у перыяд польскай інтэрвенцыі (1919-1920 гг.)**

Прычыны савецка-польскай вайны. Захоп беларускіх зямель польскімі інтэрвентамі. Акупацыйны рэжым. Палітыка Я. Пілсудскага ў беларускім пытанні. Палітыка беларускіх нацыянальных партый і арганізацый у перыяд польскай акупацыі. Падпольная і партызанская барацьба ў тыле польскіх акупантаў. Наступленне Чырвонай Арміі на Заходнім фронце. Паўторнае абвяшчэнне БССР. Контрудар польскіх войск. Падпісанне перамір'я і яго ўмовы. Разгром войск Булак-Булаховіча. Рыжскі мірны дагавор. Палітыка-эканамічныя вынікі савецка-польскай вайны. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

## Раздзел II. Беларусь у межваенны перыяд

**Тэма 4: Новая эканамічная палітыка на Беларусі**

Эканамічная і ўнутрыпалітычнае становішча рэспублікі пасля заканчэння грамадзянскай вайны. Палітыка "ваеннага камунізму". X з'езд РКП(б). Сутнасць і мэты новай эканамічнай палітыкі. Сістэма мерапрыемстваў НЭПа ў горадзе і на вёсцы. Кааперацыя, яе асноўныя віды і іх развіццё на Беларусі. Згортванне НЭПа, яго вынікі і ўрокі. Асноўныя дыскусійныя пытанні..

**Тэма 5. Нацыянальна-дзяржаўнае будаўніцтва ў 1921 – 1927 гг.**

Аб'яднанне савецкіх рэспублік у адзіным дзяржаўным саюзе. IV з'езд Саветаў БССР і яго рашэнні. I з'езд Саветаў СССР. Першае ўзбуйненне БССР. VI з'езд Саветаў Беларусі. Новы адміністратыўны падзел Беларусі. Другое ўзбуйненне тэрыторыі Беларусі. Канстытуцыя Беларусі 1927 г. Стан навуковага вывучэння праблемы. Дыскусійныя пытанні.

**Тэма 6. Грамадска-палітычнае і культурнае жыццё ў 20-я гады XX стагоддзя**

Палітыка беларусізацыі і яе сутнасць, мэты і задачы, цяжкасці і поспехі. Станаўленне сістэмы адукацыі. Ліквідацыя масавай непісьменнасці. Стварэнне вышэйшай школы. Развіццё навукі. Інстытут беларускай культуры. Навуковая і педагагічная дзейнасць У. Пічэты, У.Ігнатоўскага, З. Жылуновіча. Развіццё краязнаўства. Літаратурныя аб'яднанні. Я. Купала, Я. Колас, К. Чорны. Тэатральнае, музычнае, выяўленчае мастацтва. Музеі. Асноўныя навуковыя працы.

**Тэма 7. Ажжыццяўленне індустрыялізацыі ў БССР**

Неабходнасць індустрыялізацыі і асаблівасці яе правядзення ў рэспубліцы. Новае прамысловае будаўніцтва і рэканструкцыя старых прадпрыемстваў. Падрыхтоўка кадраў НТР і кваліфікаваных рабочых. Стаханаўскі рух. Вынікі індустрыялізацыі ў БССР. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 8. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР**

Становішча сельскай гаспадаркі рэспублікі ў канцы 20-х гадоў. Формы і метады правядзення калектывізацыі. Цяжкасці і памылкі ў калгасным будаўніцтве, іх аб'ектыўныя і суб'ектыўныя прычыны. Рэпрэсіі супраць сярэднікоў і іх "раскулачванне". Арганізацыйна-гаспадарчае ўмацаванне калгасаў. МТС і іх роля ў

калгаснай вытворчасці. Саўгасы, іх вытворчасць. Завяршэнне калектывізацыі і яе вынікі. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 9: Культурнае развіццё ў 30-я гады**

Пераход да абавязковага сямігадовага навучання. Вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя. Навука. Развіццё беларускай літаратуры, тэатра, архітэктуры. Фарміраванне ў рэспубліцы адміністрацыйна-каманднай сістэмы кіравання. Згортванне беларусізацыі. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 10: Заходняя Беларусь у складе Польшчы (1921 – 1939 гг.)**

Палітыка польскіх улад. Віленскі канфлікт. Становішча рабочых і сялян. Нацыянальна-вызваленчы, рабочы і сялянскі рух. Эміграцыя. Аграрныя рэформы і іх сутнасць. Дзейнасць палітычных партый і арганізацый. Б. Тарашкевіч. Клуб "Змаганне". Дзейнасць "Таврыства беларускай школы" (ТБШ). І. Дварчанін, П. Пестрак, Р. Шырма і інш. грамадска-палітычная думка. Забастовачная барацьба і партызанскі рух. Праблема стварэння антыфашысцкага народнага фронта. Роспуск КПП, КПЗБ і КСМЗБ. Стан навуковага вывучэння праблемы.

**Тэма 11. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР**

Паход Чырвонай Арміі ў Заходнюю Беларусь. Арганізацыя часовых органаў кіравання, іх дзейнасць. Народны сход і яго рашэнні. Прыняцце Заходняй Беларусі ў склад СССР і ўз'яднанне яе з БССР. Стварэнне органаў Савецкай ўлады і іх дзейнасць. Перадача Віленскага краю Літве. Гістарычнае значэнне ўз'яднання беларускага народа ў адзінай дзяржаве. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

## Раздзел III. Беларусь у гады другой сусветнай і Вялікай Айчыннай войнаў

**Тэма 12. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны**

Вераломны напад фашысцкай Германіі на СССР. Баі ў прыгранічных раёнах. Абарона Брэсцкай крэпасці. Баі пад Мінскам, Барысавам. Абарона Магілёва і Гомеля. Прычыны паражэння савецкіх войск у першы перыяд вайны. Акупацыйны рэжым фашысцкіх захопнікаў, іх палітыка. Калабарацкія арганізацыі на Беларусі. Другі "Усебеларускі кангрэс". Масавае знішчэнне насельніцтва. Карныя экспедыцыі. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 13. Партызанская і падпольная барацьба на акупіраванай тэрыторыі**

Стварэнне сеткі падпольных партыйных і камсамольскіх арганізацый. Баявая дзейнасць партызан і падпольшчыкаў. Стварэнне ЦШПР і БШПР. Партызанскія рэйды. "Рэйкавая вайна". Асаблівасці разгортвання партызанскага руха ў Заходняй Беларусі. Армія Краёва, яе мэты, тактыка і дзейнасць. Асноўныя навуковыя працы па праблеме.

**Тэма 14. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў**

Уступленне савецкіх войск на тэрыторыю рэспублікі і вызваленне яе ўсходніх раёнаў. Узаемадзеянне партызан з часцямі Чырвонай Арміі. Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён", яе вынікі. Ваенна-палітычнае і стратэгічнае значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі. Уклад беларускага нароад ў разгром

Германіі і Японіі. Страты Беларусі ў Другой сусветнай вайне. Асноўныя дыскусійныя пытанні. Стан навуковага вывучэння праблемы.

## Раздзел IV.Беларусь у 1945 – другой палове 80-х гадоў

**Тэма 15. Аднаўленне і развіццё народнай гаспадаркі і культарнай сферы ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе**

Масовы ўдзел насельніцтва рэспублікі ў аднаўленчых работах. Аднаўленне прамысловасці і стварэнне яе новых галін, індустрыялізацыя заходніх абласцей рэспублікі. Дапамога народаў СССР у аднаўленні сельскай гаспадаркі. Калектывізацыя ў заходніх абласцях. Аднаўленне дзейнасці партыйных, савецкіх органаў і грамадскіх арганізацый пасля вайны. Матэрыяльнае і бытавое становішча працоўных рэспублікі. Аднаўленне сістэмы адукацыі, навукі, сеткі культурна-асветніцкіх устаноў. Літаратура. Тэатр. Музыка. Архітэктура. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 16. Эканоміка Беларусі ў сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 1980-х гг.**

Эканамічная рэформа 1965 года. Асаблівасці навукова-тэхнічнага прагрэса ў Беларусі ва ўмовах НТР. Змены ў структуры прамысловасці. Ажыццяўленне эканамічнай рэформы ў сельскай гаспадаркі. Спецыялізацыя і канцэнтрацыя сельскагаспадарчай вытворчасці. Меліарацыя і хімізацыя. Стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Асноўныя навуковыя працы па тэме.

**Тэма 17. Грамадска-палітычнае, сацыяльнае і культурнае развіццё рэспублікі ў сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 1980-х гг.**

Спробы дэмакратызацыі грамадскага жыцця. Рэабілітацыя ахвяр культу асобы. Дзейнасць КПБ, Саветаў, прафсаюзаў і камсамола. Змены сацыяльнай структуры насельніцтва. Жыццёвы ўзровень насельніцтва. Пераход да абавязковай васьмігадовай і ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Прафесійна-тэхнічная адукацыя. Вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя вучэбныя ўстановы. Развіццё фундаментальнай навукі. Літаратура, мастацтва і народная творчасць. Гістарыяграфія пытання.

**Тэма 18. Міжнародныя сувязі БССР у сярэдзіне 50-х – сярэдзіне 80-х гг.**

Заключэнне міжнародных дагавораў і актывізацыя дзейнасці рэспублікі ў міжнародных арганізацыях. Міжнародныя сувязі дзяржаўных органаў і грамадскасці. Знешнепалітычныя адносіны. Культурнае супрацоўніцтва. Навуковы абмен.Стан навуковага вывучэння праблемы.

**Тэма 19. Грамадска-палітычнае жыццё (1985 – пачатак 1990-х гг.)**

Неабходнасць карэнных пераўтварэнняў у грамадстве. Курс на перабудову. Дэмакратызацыя грамадскага жыцця. Развіццё галоснасці і плюралізму думак. Узнікненне палітычнай апазіцыі. Саветы і грамадска-палітычнае жыццё. Крызіс аднапартыйнай сістэмы. Утварэнне і дзейнасць палітычных партый і грамадска-палітычных рухаў. Фарміраванне шматпартыйнай сістэмы. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

## Раздел V. Беларусь на сучасным этапе

**Тэма 20. Абвяшчэнне незалежнасці Рэспублікі Беларусь**

Прыняцце Дэкларацыі аб дзяржаўным суверэнітэце. Жнівеньскі (1991 г.) путч і яго вынікі. Наданне Дэкларацыі статуса канстытуцыйнага закона. Закон БССР аб

назве рэспублікі. Фарміраванне дзяржаўных інстытутаў улады. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (1994 г. са змяненнямі і дапаўненнямі). Станаўленне прэзідэнтскай палітычнай сістэмы ў Беларусі. Рэферэндумы ў маі 1995 г. і лістападе 1996 г., іх вынікі.

**Тэма 21. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь (пачатак 1990-х - 2022 гг.)**

Разбурэнне эканамічных сувязей пасля развала СССР. Эканамічныя рэформы, іх станоўчыя і адмоўныя вынікі. Новыя формы ўласнасці і гаспадарвання.прыватызацыя і яе супярэчнасці. Зараджэнне прадпрымальніцтва. Стварэнне камерцыйных структур. Фермерство. Цяжкасці перабудовы эканомікі рэспублікі да рыначнай. Праграма Прэзідэнта Беларусі і ўрада па выхаду з крызісу. Сацыяльная палітыка. Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, зацверджаныя I, II, III, IV, V і VI Усебеларускімі народнымі сходамі.

**Тэма 22. Навука і культура Беларусі у канцы XX – пачатку XXI стст.**

Дасягненні беларускіх вучоных. Супярэчлівасці развіцця навукі. Закон аб дзяржаўнасці беларускай мовы. Дзейнасць Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны і Беларускага фонда культуры. Адукацыя. Літаратура і мастацтва. Вяртанне незаслужана забытых твораў і імёнаў дзеячаў культуры. Сродкі масавай інфармацыі. Пазіцыі праваслаўнай царквы і каталіцкага касцёла. Грамадскі рух за ахову прыроды, помнікаў гісторыі і культуры. Дыскусійныя пытанні.

**Тэма 23. Удзел Беларусі ў Садружнасці Незалежных Дзяржаў**

Развал СССР і ўтварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў (СНД). Алма-Ацінская Дэкларацыя. Інтарнацыянальныя сувязі Рэспублікі Беларусь з дзяржавамі Садружнасці. Узаемадзеянне дзяржаў Садружнасці ў ваеннай сферы ў барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і тэрарызмам. Механізм выканання міждзяржаўных пагадненняў дзяржаў Садружнасці. Становішча СНД і перспектывы яго развіцця. Арганізацыя дагавора аб калектыўнай бяспеке (АДКБ). Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 24. Станаўленне і развіццё Саюзнай Дзяржавы**

Этапы яднання народаў Беларусі і Расіі. Саюзная дзяржава і яе органы. Эканамічная інтэграцыя. Рэгіянальная супрацоўніцтва. Развіццё навукі і тэхнікі. Фарміраванне адзінай адукацыйнай прасторы. Беларуска-расійскае культурнае ўзаемадзеянне. Саюзныя праграмы і праекты. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 25. Міжнародныя сувязі Рэспублікі Беларусь**

Асноўныя мэты і задачы рэспублікі ў сферы міжнародных адносін. Дыпламатычнае прызнанне Рэспублікі Беларусь. Павышэнне актыўнасці ў дзейнасці ААН. Эканамічныя сувязі з замежнымі краінамі. Развіццё культурнага супрацоўніцтва. Беларусь і Еўразійскае эканамічнае згуртаванне (ЕўрАзЭс). Беларусь і Адзіная эканамічная прастора. Новыя геапалітычныя рэаліі. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

**Тэма 26. Беларуская дыяспара: гісторыя і сучаснасць**

Гісторыя эміграцыі, яе асноўныя этапы. Развіццё эмігранцкіх супольнасцяў. Культурная спадчына беларусаў-эмігрантаў. Новая дзяржаўная палітыка ў дачыненні да дыяспары. Знакамітыя землякі. Асноўныя дыскусійныя пытанні.

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## АСНОЎНАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Гісторыя беларускай дзяржаўнасці : вучэбны дапаможнік для студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі / Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ; аўт.: І. А. Марзалюк, А. Г. Каханоўскі, С. М. Ходзін, Д. У. Дук [і інш.] ; рэд.: І. А. Марзалюк, Г. Г. Краско. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2022. – 447 с.

2. Дмитрачков, П. Ф. Современные проблемы отечественной истории : учеб.-метод. пособ. / П. Ф. Дмитрачков. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2020. – 252 с.

3. Дмитрачков, П. Ф. Белорусская государственность: история зарождения и развития (VI – начало XX вв.) : учеб.-метод. комплекс / П. Ф. Дмитрачков. – Могилев : МГУ имени А.А. Кулешова, 2021. – 176 с.

4. История Беларуси в контексте европейской цивилизации / В. И. Голубович [и др.]. – 2-е изд. – Минск : Экоперспектива, 2018. – 147 с.

## ДАДАТКОВАЯ ЛІТАРАТУРА

1. Белявина, В. Н. Беларусь в годы Первой мировой войны / В. Н. Белявина. – Минск : Беларусь, 2013. – 398 с.

2. Вішнеўская, І. У. Гісторыя палітычнай і прававой думкі Беларусі на мяжы еўрапейскіх цывілізацый (IX – пачатак XXI ст.) / І. У. Вішнеўская. – Мінск : Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь. Акадэмія МУС. 2008. – 296 с.

3. Вклад белорусского народа в Победу в Великой Отечественной войне / А. М. Литвин [и др.] ; редкол.: А. А. Коваленя (гл. ред.) [и др.]. – 2-е изд. – Минск : Беларус. навука, 2016. – 495 с.

4. Вялікая Айчынная вайна савецкага народа (у кантэксце Другой сусветнай вайны): вучэб. дапаможік для студэнтаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / А. А. Каваленя [і інш.]. – Мінск : Выд. цэнтр Беларус. дзярж. ун-та, 2004. – 278 с.

5. Геноцид белорусского народа = Genocide of the Belarusian people: информационно-аналитические материалы и документы / Генеральная прокуратура Республики Беларусь; под общ. ред. А. И. Шведа. – Минск : Беларусь, 2022. – 175 с.

6. Грамадска-палітычнае жыццё ў Беларусі, 1772–1917 гг. / А. У. Унучак [і інш.]; рэдкал.: В. В. Даніловіч (гал. рэд.) [і інш.] ; Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі. – Мінск: Беларус. навука, 2018. – 573 с.

7. Дмитрачков, П. Ф. История Беларуси**.** С древнейших времен до конца XVIII века : учеб.-метод. комплекс для студентов исторических специальностей / П. Ф. Дмитрачков. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2015. – 353 с.

8. Доўнар-Запольскі, М. В. Асновы дзяржаўнасці Беларусі / М. В. Доўнар-Запольскі. – Мінск : ДІКСТ БДУ, 2011. – 33 с.

9. Доўнар, Т. І. Канстытуцыйнае права Беларусі феадальнага перыяду (па Статутах Вялікага княства Літоўскага 1529, 1566, 1588) / Т. І. Доўнар. – Мінск : БДУ, 2001. – 76 с.

10. Доўнар, Т. І. Развіццё асноўных інстытутаў грамадзянскага і крымінальнага права Беларусі ў XV–XVI стагоддзях / Т. І. Доўнар. – Мінск : Пропилеи, 2000. – 224 с.
11. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. – 3-е выд. – Мінск : Амалфея, 2009. – 399 с.
12. Канфесіі на Беларусі (канец XVIII – XX стст.) / навук. рэд. У. І. Навіцкі. – Мінск : Экаперспектыва, 1998. – 340 с.
13. Канфесійны фактар у сацыяльным развіцці Беларусі (канец XVIII – пачатак XX ст.) / В. В. Яноўская [і інш.]. – Мінск: Беларуская навука, 2015. – 496 с.
14. Круталевич, В. А. История Беларуси : становление национальной державности (1917–1922 гг.) / В. А. Круталевич. – 2-е изд., доп. – Минск : Право и экономика, 2003. – 585 с.
15. Ладысеў, У. Ф. Паміж Усходам і Захадам: станаўленне дзяржаўнасці і тэрытарыяльнай цэласнасці Беларусі (1917–1939 гг.) / У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. – Мінск : БДУ, 2003. – 307 с.
16. Малиновский, В. И. История белорусской государственности : учеб. пособие для студентов вузов, слушателей системы последипломного образования / В.И. Малиновский. – Минск : Беларусь, 2003 – 199 с.
17. Марзалюк, І. А. Людзі даўняй Беларусі: этнаканфесійныя і сацыякультурныя стэрэатыпы (X-XVII стст.) : манаграфія / І. А. Марзалюк. - Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. - 324 с.
18. Марзалюк, І. А. Этнічны і канфесійны свет беларускага горада XVI-XVIII стст. (этнаканфесійны склад насельніцтва, этнічныя і канфесійныя стэрэатыпы беларускіх гараджан) : манаграфія / І. А. Марзалюк. - Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. - 165 с.
19. Марзалюк, І. А. Міфы «Адраджэнскай» гістарыяграфіі Беларусі : манаграфія / І. А. Марзалюк. - Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2009. - 172 с.
20. Марзалюк, И. А. 100 лет БССР. Реалии и мифы / И. А. Марзалюк. – Минск : Белорус. Энцикл. имени П. Бровки, 2020. – 200 с.
21. Пілецкі, В. А. Гісторыя культуры Беларусі : вучэб. дапам. для студэнтаў негістарычных факультэтаў ВНУ / В. А. Пілецкі. – Мінск : Мінскі інавацыйны ўн-т, 2017. – 401 с.
22. Освобождение Беларуси, 1943–1944. / ред. кол. И. И. Басик, А. А. Каваленя [и др.] – Минск : Беларус. навука, 2014. – 944 с.
23. Основы идеологии белорусского государства : учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования / В. А. Мельник. – 3-е изд., исправленное. – Минск : Вышэйшая школа, 2013. – 342 с.
24. Проблемы формирования белорусской государственности в XX – начале XXI вв.: избранные труды Н. С. Сташкевича / под науч. ред. А. Н. Данилова, В. С. Кошелева. – Минск : РИВШ, 2012. – 240 с.
25. Экономическая история Беларуси : учеб. пособ. для вузов / под ред. В. И. Голубовича. – 3-е изд., доп. – Минск : Экоперспектива, 2004. – 400 с.
26. Ярмусік, Э.С. Канфесійная гісторыя Беларусі: вучэб. дапам. / Э.С. Ярмусік. – Мінск : РІВШ, 2016. – 199 с.